НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

БЕЛАРУСЬ
ПРАЗ ПРЫЗМУ
РЭГІЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ

# Крэва і акруга:

## гісторыя, археалогія, культурная спадчына



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

**БЕЛАРУСЬ
ПРАЗ ПРЫЗМУ
РЭГІЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ**

# Крэва і акруга:

## гісторыя, археалогія, культурная спадчына

*Зборнік навуковых артыкулаў*

Мінск
«Беларуская навука»
2025

УДК [94+908](476.6-22Крэва)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43
К85

*Серыя заснавана ў 2018 годзе*

Укладальнік, навуковы рэдактар
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. І. Дзярновіч

Рэдакцыйная калегія:
В. Л. Лакіза (галоўны рэдактар), В. Ф. Голубеў, А. І. Дзярновіч,
А. Б. Доўнар, П. А. Трубчык, Н. Ю. Перавалава

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук, дацэнт А. А. Мяцельскі,
кандыдат гістарычных навук С. У. Грунтоў

*Зборнік падрыхтаваны ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі А. А. Каваленя), падпраграмы № 1 «Гісторыя» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. Л. Лакіза)*

К85 **Крэва і акруга** : гісторыя, археалогія, культурная спадчына : зб. навук. арт. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі ; уклад., навук. рэд. А. І. Дзярновіч ; рэдкал.: В. Л. Лакіза (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2025. – 283 с. : іл. – (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).
ISBN 978-985-08-3358-7.

У зборніку навуковых артыкулаў прадстаўлена багатая гістарычная, археалагічная, культурная спадчына Крэва. Змешчаныя матэрыялы тычацца праблем балта-славянскіх кантактаў, рэстаўрацыі Крэўскага замка, а таксама пытанняў гісторыі мястэчка позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу, падзей Першай сусветнай вайны ў Крэве. Асобнае месца надаецца асвятленню шматэтнічнай спадчыны Крэва і яго ваколіц.

Выданне разлічана на навукоўцаў і краязнаўцаў. Будзе карысным навучэнцам і ўсім, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай нашай краіны.

**УДК [94+908](476.6-22Крэва)(082)**
**ББК 63.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-08-3358-7**

© ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2025
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2025

## ЗМЕСТ

**Прынятыя скарачэнні** ........ 3

**Прадмова** ........ 4

**Працяг традыцыі. Слова ад укладальніка** ........ 10

**Прывітальнае слова ўдзельнікам Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Крэўскія чытанні: гісторыя, археалогія, культурная спадчына Крэва» намесніка старшыні Смаргонскага райвыканкама Ігара Шчаснага** ........ 17

**Приветственное слово участникам круглого стола «Историческая память: Первая Мировая война сквозь призму времени» заместителя председателя Сморгонского райисполкома Игоря Счастного** ........ 19

### СТАРАЖЫТНАЕ КРЭВА І ПРАБЛЕМА САЦЫЯЛЬНАЙ І ЭКАНАМІЧНАЙ ГІСТОРЫІ XIII–XX стст.

**Вадзім Шадыра** *(Мінск).* Балты – Нёман – «Русь» (варыяцыі на тэму паходжання вядомага этноніма) ........ 21

**Витас Янкаускас** *(Каунас).* Кревское княжество в системе власти Великого Княжества Литовского в середине XIV в. ........ 27

**Валерый Пазднякоў** *(Мінск).* Каралеўскі прывілей 1602 г. мяшчанам Крэўскай плябаніі ........ 35

**Аляксандр Ерашэвіч** *(Мінск).* Дзяржаўныя падаткі і падаткаабкладанне насельніцтва мястэчак Беларусі ў першай палове XIX ст. ........ 40

**Віталь Гарматны** *(Мінск).* Аграрныя пераўтварэнні на тэрыторыі гміны Крэва ў міжваенны перыяд ........ 52

**Вікторыя Капыш,** кіраўнік работы **Міхаіл Міхалькевіч** *(Крэва).* Ад сталіцы княства да цэнтра сельскага савета (Крэва ў розных тэрытарыяльна-адміністрацыйных утварэннях з XIII па XXI ст.) ........ 72

**Олег Лашицкий** *(Минск).* Деятельность еврейских семейных партизанских лагерей и отрядов Тувии Бельского и Шолома Зорина в годы Великой Отечественной войны 1941–1944 гг. ........ 86

### МАНУМЕНТАЛЬНЫЯ ПОМНІКІ КРЭВА: ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ, РЭСТАЎРАЦЫІ І МУЗЕЕФІКАЦЫІ

**Владимир Синявский, Елена Карленок** *(Минск).* Концепция консервации и реставрации Кревского замка ........ 104

**Алег Дзярновіч, Андрэй Шулаеў** *(Мінск).* Пытанне лакалізацыі Малой брамы Крэўскага замка ........ 112

**Андрэй Шулаеў** *(Мінск).* Будынак Крэўскай мураванай сінагогі: трансфармацыя вобразу і функцыі ........ 148

## ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ XX СТАГОДДЗЯ

**Владимир Богданов** *(Минск).* «Фердинандов Нос», расколовший наступление: борьба за стратегическую высоту у Крево в 1915–1917 гг. ........ 169

**Сергей Нелипович** *(Москва).* Армии Западного фронта в летней кампании 1916 г. .... 205

**Михаил Смольянинов** *(Минск).* 76-я пехотная дивизия русской армии в годы Первой мировой войны ........ 231

**Сяргей Лапановіч** *(Мінск).* Бежанства і эвакуацыя ў гады Першай сусветнай вайны як найбуйнейшая міграцыя насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў XX ст. ........ 241

**Андрей Каркотко** *(Вилейка).* Установление имен героев Первой мировой войны, изображенных на старых фотографиях ........ 260

**Вячеслав Гришаков** *(г. Каменка, Пензенская область).* Проблемы изучения темы Первой мировой войны в региональной историографии (на примере Каменского района Пензенской области) ........ 273

**Звесткі пра аўтараў** ........ 280

**Алег Дзярновіч, Андрэй Шулаеў** *(Мінск)*

# ПЫТАННЕ ЛАКАЛІЗАЦЫІ МАЛОЙ БРАМЫ КРЭЎСКАГА ЗАМКА

Ад 2017 г. распачаўся новы этап даследаванняў, кансервацыі і рэстаўрацыі Крэўскага замка. У рамках гэтага працэсу адбываецца карэкціроўка праектнай дакументацыі ў сувязі з выяўленнем новых дэталей і аб'ектаў, выяўленых падчас архітэктурна-археалагічных даследаванняў. Адным з яскравых прыкладаў падобнай сітуацыі з'яўляецца лакалізацыя так званай Малой брамы ў паўднёва-заходняй сцяне замка ў 2022 г. і далейшая яе рэканструкцыя на працягу 2023 г.

## Тэрміналогія і гісторыя вывучэння

Тут варта асобна спыніцца на пытаннях тэрміналогіі. У другой палове XX – пачатку XXI ст. даследчыкі фіксавалі наяўнасць адной брамы («Галоўнай»), размешчанай па паўночна-заходняй сцяне замка. Часам за адну з брам («запасных»[1], «таемных») прымаўся арачны праём у паўночна-заходняй сцяне замка, які выкананы з характэрнай спічастай аркай вышынёй 2,5 м і шырынёй 2,25 м. Падобна, што адзін з заснавальнікаў беларускага мастацтвазнаўства Мікалай Шчакаціхін таксама ўспрымаў гэты праём як браму на заходняй сцяне[2] (яшчэ адну браму ён размяшчаў на паўднёвым муры, пра які вядзецца гаворка ў гэтай публікацыі). Мы ж схільныя разглядаць гэты праём, які знаходзіцца вельмі нізка, як частку сістэмы гідрарэгуляцыі.

Назіранні на гэты конт былі зроблены яшчэ ў XIX ст. Крэўскі святар і краязнаўца другой паловы XIX ст. Дзяменцій Плаўскі, які пакінуў даволі падрабязнае візуальнае апісанне замка, адзначаў, што *«есть еще одно [отверстие] при самой поверхности земли, въ западной стене, в виде полукруга, величиной одинъ аршинъ въ діаметре [0,7112 м]. Оно служило для впуска воды, въ случае осады замка, такъ какъ внутри замка есть признаки канала, который наполнялся водою»*[3].

Але Д. Плаўскі апісаў таксама наяўныя ў яго час брамы: *«Въ стенахъ находятся четыре отверстія, изъ коихъ два по северной и южной сторонамъ, вероятно, составляли входы въ замокъ третье же и четвертое въ углахъ северо-восточной и противоположной ей стороны образовались отъ об-*

---

[1] *Ткачоў М. А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. – Мн. : Навука і тэхніка, 1978. – С. 36.

[2] *Шчакаціхін М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. – Менск, 1928. – Т. 1. – (Рэпрынт: Мн. : Навука і тэхніка, 1993). – С. 148.

[3] *Плавский Д.* Местечко Крево : (ист.-этногр. очерк). – [Вильно] : печ. А. Сыркина, 1871. – С. 3.



pawet.net

*вала стенъ»*[1]. Што важна, Плаўскі падаў таксама і параметры паўднёвай брамы: *«Изъ двухъ первыхъ отверстий одно на южной стороне, сохранило отчасти прежние формы; на противоположной же обрушилась. Ширина въ основанiи уцелевшего входа 4 аршина, вышина до шести аршинъ имеетъ къ верху овальную форму»*[2]. З улікам адпаведнасці аршына 0,7112 м параметры аркі брамы наступныя – 4,26 м і 2,84 м, што ў свой час было падлічана яшчэ Міхасём Ткачовым[3]. Святар і краязнавец апісаў таксама размяшчэнне брамы адносна паверхні зямлі: *«Отверстiе это находясь на сажень выше поверхности земли. Должно полагать, имела подвижныя подмотки съ обоихъ сторонъ. Были ли въ этихъ отверстiяхъ утверждены ворота – признаковъ неть»*[4]. Падобнае размяшчэнне брамы адпавядае вядомым захаваным аналагам у Лідскім і Медніцкім замках.

Пра браму на паўднёвай сцяне пісаў таксама Міхал Балінскі ў сваім сумесным з Цімафеем Ліпінскім даследаванні «Старажытная Польшча»[5]. Гэтыя ж звесткі паўтарыў Часлаў Янкоўскі ў працы «Павет Ашмянскі»[6]. Балінскім і Янкоўскім адзначалася таксама наяўнасць брамы ва ўсходняй сцяне, але гэта тэма для іншага аналізу.

Такім чынам, варыянты назвы брамы, якія ўжываліся ў літаратуры, – «Паўднёвая» (Д. Плаўскі) і «Запасная» (М. Ткачоў). Мы ж спыніліся на назве «Малая брама» – у супрацьпастаўленні з Галоўнай брамай на паўночна-ўсходнім муры, якая знаходзілася пад абаронай данжона (Княжацкай вежы). Назва ж «Галоўная брама» таксама з'яўляецца тэхнічнай. Гістарычныя назвы брам не вядомы і не фігуруюць у выяўленых пісьмовых крыніцах.

## Іканаграфія Малой брамы ў XIX ст.

Апроч тэкставага апісання з XIX – пачатку XX ст. засталося некалькі выяў Малой вежы – мастацкіх і фатаграфічных. Найперш гэта акварэль 1827 г., якая, на дадзены момант, з'яўляецца першай вядомай выявай Крэўскага замка (іл. 1).

Гаворка вядзецца пра малюнак у «Атласе замкаў Віленскай губерні»[7], выкананы інжынерам Георгіем Велікародавым паводле цыркуляра Міні-

---

[1] *Плавский Д.* Местечко Крево: (ист.-этногр. очерк). – С. 4.

[2] Тамсама.

[3] *Ткачоў М. А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. – С. 36.

[4] *Плавский Д.* Местечко Крево : (ист.-этногр. очерк). – С. 5.

[5] *Baliński M., Lipiński T.* Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym opisana. – Warszawa : S. Orgielbrand, 1846. – T. 3 : Wielkie Księztwo Litewskie. – S. 234.

[6] *Jankowski Cz.* Powiat Oszmiański. Materjały do dziejów ziemi i ludzi. – Sankt Petersburg : Księgarnia K. Grendyszczyńskiego, 1897. – Cz. 2. – S. 203.

[7] Muzeum Narodowe w Krakowie. – MNK III-r. a-18320/7 («Атлас замков Виленской губернии»).




Іл. 1. Крэўскі замак. Выява 1827 г. Выгляд з паўднёва-ўсходняга боку
(«Атлас замков Виленской губернии». Muzeum Narodowe w Krakowie. MNK III-r.a-18320/7)



Іл. 2. Крэўскі замак. План 1827 г.
(«Атлас замков Виленской губернии».
Muzeum Narodowe w Krakowie. MNK III-r.a-18320/7)



Іл. 3. План мястэчка Крэва 1851 г.
(Lietuvos valstybes istorijos archyvas. F. 525. Ap. 2. B. 1986)



Іл. 4. План замка ў мястэчку Крэва. Сярэдзіна XIX ст.
(Vilniaus universiteto biblioteka. F78-206b. ID VUB01_000388029)

стэрства ўнутраных спраў да грамадзянскіх губернатараў «Аб дастаўцы звестак пра рэшткі старажытных збудаванняў і аб забароне разбураць іх» ад 31 снежня 1826 г.[1] Інжынерам Велікародавым быў створаны як акварэльны малюнак замка (іл. 1), так і яго план (іл. 2). Ракурс выявы быў абраны даволі нязвыклы – паўднёва-ўсходні. Дзякуючы гэтаму вельмі выразна бачны праём у паўднёвым муры, які можна інтэрпрэтаваць як адзін з уваходаў у замак. Брама знаходзіцца вышэй узроўню зямлі і паводле малюнка займае цэнтральную па вышыні частку сцяны – $^{1}/_{3}$ мура. У сваю чаргу, на плане замка гэтая брама, размешчаная на сярэдзіне прасла (без уліку шырыні Малой вежы), дакладна падпісана «ворота». Праём брамы ў паўднёвай сцяне мы таксама бачым на плане мястэчка Крэва ад 1851 г. (іл. 3)[2]. Важна адзначыць, што Галоўная брама на гэтым плане не выяўлена, што сведчыць пра дэструкцыю ўжо тады гэтай часткі паўночнай (паўночна-заходняй) сцяны. Як захаваная Малая брама, так і сцянны праём на месцы незахаванай Галоўнай брамы паказаны яшчэ на адным плане, але ўжо ўласна замка, які датуецца сярэдзінай XIX ст. і захоўваецца ў бібліятэцы Вільнюскага ўніверсітэта[3] (іл. 4).

[1] Сборник материалов, относящихся до архивной части в России. – Пг., 1916. – Т. 1. – С. 586–587; Охрана культурного наследия России XVII–XX вв. : хрестоматия / авт.-сост.: Л. В. Карпова, Н. А. Потапова, Т. П. Сухман. – М. : Весь Мир, 2000. – Т. 1. – С. 97–98. – № 96; *Полякова М. А.* Охрана культурного наследия России. – М. : Дрофа, 2005. – С. 28–29.

[2] Lietuvos valstybes istorijos archyvas (LVIA, Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў). – F. 525. Ap. 2. B. 1986 («Планъ местечка Крево. 1851 г.»).

[3] Vilniaus universiteto biblioteka (VUB, Бібліятэка Вільнюскага ўніверсітэта). – F78-206b. ID VUB01_000388029 («Планъ замка въ м. Креве»).



Іл. 5. Браніслаў Тамашэвіч. Крэўскі замак
(Jankowski Cz. Powiat Oszmiański. Materjały do dziejów ziemi i ludzi. Sankt Petersburg ; Kraków, 1897. Cz. 2. S. 206)

На ўсіх пазнейшых выявах Крэўскага замка ўласна Малая брама адсутнічае, што выклікана таксама ракурсам выгляду замка, які абіралі мастакі. Але ў 1897 г. выява Малой брамы аўтарства Браніслава Тамашэвіча з'яўляецца зноў у якасці ілюстрацыі да працы Ч. Янкоўскага «Павет Ашмянскі» (іл. 5)[1].

## Малая брама ў часы Першай сусветнай вайны

Першая сусветная вайна (далей – ПСВ) стала адной з вырашальных падзей для гісторыі замка і ўсяго Крэва. Менавіта ў выніку ваенных дзеянняў Крэўскі замак зазнаў адны з самых моцных разбурэнняў, але таксама ў ім з'явіліся новыя фартыфікацыйныя аб'екты. Адначасова ваенны перыяд пакінуў нам найбольшую колькасць фотафіксацый замка, чым за ўвесь папярэдні і наступны, да 1945 г., перыяд. Гэтыя здымкі адлюстроўваюць важную інфармацыю пра архітэктурна-канструкцыйныя асаблівасці замка, у тым ліку яго Малую браму. Многія з гэтых здымкаў захоўваліся ў прыватных архівах былых жаўнераў кайзераўскага войска і іх нашчадкаў. Трапіўшы на аўкцыёны, такія здымкі, на жаль, не заўсёды ўтрымліваюць дакладнага аўтарства і датавання. Тым не менш іх прывязка да 1915–1917 гг. вельмі верагодная. Два здымкі замка, зробленыя з паўднёвай і паўднёва-заходняй перспектывы, могуць датавацца да маштабнага разбурэння замка ў ліпені 1917 г., і на іх адлюстравана Малая брама звонку.



Іл. 6. Крэўскі замак на паштовай картцы нямецкай палявой пошты, 1915–1917 гг. Выгляд з захаду (калекцыя Уладзіміра Багданава)

[1] *Jankowski Cz.* Powiat Oszmiański. Materjały do dziejów ziemi i ludzi. – Cz. 2. – S. 206.



Іл. 7. Цагляная муроўка аркі Малой брамы. Павялічаны фрагмент з выявы Крэўскага замк
на паштовай картцы нямецкай палявой пошты, 1915–1917 гг.
(калекцыя Уладзіміра Багданава)



Іл. 8. Крэўскі замак. Выгляд з захаду. З фотаальбома афіцэра 379-га ландвернага палі
16-й ландвернай дывізіі, сакавік 1916 г. (калекцыя Уладзіміра Багданава)




Іл. 9. Адварот фотаздымка ў выглядзе паштовай карткі
(калекцыя Уладзіміра Багданава)



Іл. 10. Павелічэнне панарамы Крэўскага замка з фотаздымка сакавіка 1916 г.
(калекцыя Уладзіміра Багданава)



Іл. 11. Выгляд аркі Малой брамы на фотаздымку сакавіка 1916 г.
(калекцыя Уладзіміра Багданава)



Іл. 12. Цэнтральны ўчастак паўднёва-ўсходняй сцяны з боку дзядзінца: ДАК і месца Малой брамы. Выгляд з поўначы. Фотаздымак: 11 мая 2022 г.



Іл. 13. Фрагмент ДАКа і верхняй бетоннай пліты да разборкі. Выгляд з паўночнага захаду. Фотаздымак: 11 мая 2022 г.

Адзін з такіх фотаздымкаў дэманструе заходні паўразбураны кут замка (іл. 6) і дае магчымасць разгледзець (пры павелічэнні) цагляную аблямоўку брамы (іл. 7). Фотаздымак наклеены на бланк Feldpostkarte (паштовай карткі нямецкай палявой пошты)[1]. Верагодная дата здымка – зіма 1915–1916 гг.

Яшчэ адзін здымак, датаваны сакавіком 1916 г. (дата пазначана на адвароце здымка), мае панарамны характар (іл. 8, 9)[2]. Што важна, здымак дае магчымасць зафіксаваць абрысы спічастай аркі са згладжаным завяршэннем (парабалічным) Малой брамы (іл. 10, 11). Гэта вельмі важныя для рэстаўратараў здымкі, таму што дазваляюць аднавіць форму і выгляд унутранай аблямоўкі Малой брамы.

Яшчэ адзін чыннік у гісторыі Малой брамы – гэта ўзвядзенне ў часы ПСВ побач з ёй фартыфікацыйнай канструкцыі з бутавага каменю ў выглядзе паўконуса (іл. 12). Гэтая пабудова была ўзведзена каля паўднёва-заходняй сцяны замка з боку дзядзінца, і яе прызначэнне ў пасляваенны час выклікала пытанні, часам яе прымалі за яшчэ адну вежу замка. Бетонная пліта перакрыцця пабудовы знаходзілася ў пераломленым стане (іл. 13, 14). Далейшыя археалагічныя даследаванні дазолілі вызначыць функцыянальнае прызначэнне канструкцыі.



Іл. 14. Пачатак разборкі завалу каля ДАКа. Выгляд з паўночнага захаду.
Фотаздымак: 2 ліпеня 2022 г.

[1] Калекцыя Уладзіміра Багданава.

[2] Здымак паходзіць з асабістага фотаальбома нямецкага афіцэра 379-га ландвернага палка 16-й ландвернай дывізіі. Калекцыя Уладзіміра Багданава.

## Даследаванні 2022 г.

Радыкальна сітуацыю з вызначэннем месца размяшчэння Малой брамы змянілі даследчыя і рэстаўрацыйныя працы 2022 г. У гэты год адбываліся работы, якія паводле рэстаўрацыйна-будаўнічай рэгламентацыі мелі афіцыйную назву «Кансервацыя з рэстаўрацыяй гісторыка-культурнай каштоўнасці "Фрагменты замка XIV ст. у в. Крэва, Смаргонскага раёна. 1-я чарга. 3-і пускавы комплекс"».

Пазначаны 3-і пускавы комплекс – гэта і ёсць кансервацыя паўднёва-заходняй сцяны Крэўскага замка з рэстаўрацыяй яе асобных элементаў і канструкцый. Падчас разборкі развалу з вонкавага боку сцяны і завалу ўнутры фартыфікацыйнай пабудовы часоў ПСВ з боку дзядзінца былі выяўлены важныя для вывучэння і рэстаўрацыі замка элементы гэтай часткі сцяны.

Аказалася, што пад заваламі і зараслямі хмызу ў сцяне была схавана амбразура (іл. 15, 16), шырынёй у знешняй частцы 1,6 м, ва ўнутранай – 0,7 м. Амбразура скіравана ў паўднёвы бок, туды, дзе ў 1915–1917 гг. знаходзіліся пазіцыі Расійскай імператарскай арміі. Апроч таго, з боку замкавага дзядзінца быў выяўлены літы бетонны кулямётны стол з жолабам для мацавання драўлянага кулямётнага станка (іл. 17–19). Стол знаходзіцца на цыліндрычнай аснове (іл. 20). Можна казаць пра захаваны амбразурны




Іл. 15. Расчыстка амбразуры ДАКа са знешняга боку замка.
Выгляд з паўднёвага захаду. Фотаздымак: 5 чэрвеня 2022 г.



Іл. 16. Амбразура ДАКа са знешняга боку замка. Выгляд з паўднёвага захаду.
Фотаздымак: 13 чэрвеня 2022 г.




Іл. 17. План ДАКа і амбразуры ў праёме Малой брамы
(архітэктар Андрэй Шулаеў)



Іл. 18. Амбразурны вузел ДАКа (амбразура і кулямётны стол).
Выгляд з поўдня. Фотаздымак: 29 чэрвеня 2022 г.



Іл. 19. Кулямётны стол ДАКа. Выгляд з поўдня.
Фотаздымак: 26 чэрвеня 2022 г.

вузел доўгатэрміновай агнявой кропкі (ДАК). Гэта досыць рэдкая знаходка для ацалелых аб'ектаў фартыфікацыі Першай сусветнай вайны.

Пасля расчысткі завалаў сталі зразумелыя параметры паўконуснай пабудовы: радыус – 3,6 м; таўшчыня сцяны – 0,83 м. З улікам наяўнасці амбразурнага вузла можна казаць, што гэта ДАК, які ўяўляе з сябе канструкцыю ў выглядзе ўсечанага конуса, складзеную з бутавага каменю на бетоннай рошчыне, накрытую бетоннай плітой (іл. 21). Гэтая агнявая кропка была створана для прыкрыцця правага фланга замка.



Іл. 20. Цыліндрычная аснова кулямётнага стала і амбразура ДАКа
з боку замкавага дзядзінца. Умацаванні канструкцыі ДАКа падчас расчысткі.
Выгляд з поўначы. Фотаздымак: 29 ліпеня 2022 г.



Іл. 21. Бетонная пліта ДАКа. Выгляд з паўднёвага захаду.
Фотаздымак: 29 чэрвеня 2022 г.



Іл. 22. Заходняя частка праёму муроўкі брамы XIV ст. на вапнавай рошчыне (злева) і бетонная вымуроўка амбразуры часоў ПСВ. Выгляд з поўдня. Фотаздымак: 13 чэрвеня 2022 г.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што паўконусная пабудова каля паўднёва-заходняй сцяны замка з'яўляецца ДАКам. Раней з дакладным прызначэннем гэтага аб'екта ПСВ былі складанасці – лічылася, што гэта мог быць бункер-сховішча. Але выяўленне амбразурнага вузла зняло пытанні па функцыянале пабудовы. Тое, што ў замку быў другі ДАК з паўднёвага боку, істотна дапаўняе разуменне арганізацыі баявых пазіцый у Крэве падчас Першай сусветнай вайны.

Далейшыя даследаванні паказалі, што амбразура была размешчана ў ніжняй частцы праёма сцяны, які меў выразныя межы ў каменнай муроўцы. На сцяне добра відаць розніца ў муроўцы XIV ст. на вапнавай рошчыне і муроўцы пачатку XX ст. на цэменце (іл. 22). Гэтыя назіранні дазволілі сфармуляваць працоўную версію пра размяшчэнне амбразуры ў праёме брамы.

### Лакалізацыя брамы

Наступным этапам даследавання стала сумяшчэнне фотаздымка часоў Першай сусветнай вайны (іл. 23) і актуальных здымкаў муроў замка, а таксама выкананай фотаграмметрыі замка (апрацоўка матэрыялаў – 1994 г.) (іл. 24). У выніку стала зразумелым, што амбразурны вузел сапраўды быў створаны ў праёме брамы (іл. 25, 26).

З-за эрозіі кулямётны стол знаходзіўся крыху ніжэй узроўню ніжняй плоскасці брамы (іл. 27). Гэты ніз праёму брамы, абвалены па цэнтры, быў забетаніраваны і, такім чынам, дах бліндажа па адзнаках роўны нізу праёму брамы (іл. 28). Такім чынам, Малая брама Крэўскага замка была дакладна лакалізавана (іл. 28, 29).



Іл. 23. Павялічаны фрагмент фотаздымка сакавіка 1916 г. з выявай аркі Малой брамы са знешняга боку замка

Першапачатковы праект кансервацыі і рэстаўрацыі прадугледжваў размяшчэнне брамы збоку ад ДАКа (іл. 30). Праведзеныя даследаванні дазволілі архітэктарам Праектнага філіяла «Белрэстаўрацыі» ўнесці карэкціроўку ў праект (іл. 31). Параметры брамы наступныя: шырыня арак у ніжняй частцы са знешняга боку замка ад 2400 да 2684 мм; з унутранага – ад 2400 да 3360 мм. Брама мела сістэму стральчатых гатычных арак.

Таксама аналіз фатаграфічных матэрыялаў часоў ПСВ дазваляе прыйсці да высновы, што ніз праёму брамы быў на той жа адзнацы, што і ніз цаглянай абмуроўкі (паса), якая са знешняга боку была вымуравана па ўсім перыметры замкавых сцен у тэхніцы вендскай (балтыйскай) муроўкі[1]. На паўднёва-заходняй сцяне гэтая абмуроўка захавалася фрагментарна (іл. 32–36), але ўдалося рэканструяваць яе ўзровень па ўсёй даўжыні мура. У дэкаратыўным цагляным пасе, які праходзіў па перыметры ўсёй знешняй сцяны Крэўскага замка, цэгла мае наступныя параметры: 30–31 × 17–17,5 × 9–9,5 см[2]. Гэтыя параметры ў цэлым характэрны і для паўднёва-заходняй сцяны, але варыятыўнасць параметраў можа дасягаць 30–33 × 16,2–17,7 × 8–9,8 см. У праёме Малой брамы таксама выяўлены сляды дэструкцыйнай цаглянай муроўкі, памеры цэглы тут магчыма зафіксаваць толькі па двух параметрах – пасцель і руб (тычок): ? × 14–15 × 8–8,5 см. Гэтыя даныя ўпісваюцца ў сярэднія памеры меншай паводле памераў цэглы Крэўскага замка: 28–28,5 (30) × 13,5 (14,5) × 7,5–8 (9) см[3].

---

[1] *Трусов О. А.* Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. : архитектурно-археологический анализ. – Мн. : Наука и техника, 1988. – С. 83–84.

[2] *Ткачев М. А., Трусов О. А.* Исторические и архитектурно-археологические исследования Кревского замка // Вопросы архитектуры Литовской ССР. История архитектуры. – 1988. – (Т.) 9 (1). – С. 19.

[3] Там же.



Іл. 24. Абмерны чарцёж паўднёва-заходняй сцяны Крэўскага замка са знешняга боку. Фотаграмметрыя (выканалі Валерый Пінчук і Ігар Русецкі). М 1 : 50. 1994 г.



Іл. 25. Накладанне абмернага чарцяжа фотаграмметрыі (паўднёва-заходняй сцяны Крэўскага замка са знешняга боку Крэўскага замка) на фотаздымак сакавіка 1916 г. Каляровыя пазначэнні: аранжавы – захаваныя ў 1916 г. фрагменты цаглянай абмуроўкі; бэзавы – размяшчэнне цаглянай абмуроўкі да яе дэструкцыі; блакітны – знешні бок каменнай абмуроўкі сцяны



Іл. 26. Супастаўленне даных фотаграмметрыі з фотаздымкам сакавіка 1916 г.
Каляровыя пазначэнні: карычневы – візуальна рэканструяваны фрагмент мура; цёмна-сіні – пазначэнне месца бліндажа ДАКа



Іл. 27. Павялічаны фрагмент здымка сакавіка 1916 г.
з азначэннем аркі Малой брамы (сіняя лінія) і лініі разбурэння (чырвоная)




Іл. 28. Фіксацыя захаванага ўзроўню паўднёва-заходняй сцяны Крэўскага замка (чорная лінія) і рэканструкцыя плоскасці сцяны разам з аркай Малой брамы (чырвоная лінія). Знешні бок. Сіняя штрыхоўка – пазначэнне аб'ёму ДАКа

Сучасныя кансервацыйна-рэстаўрацыйныя працы ўлічваюць як лакалізацыю брамы, так і захаванне аб'ектаў Першай сусветнай вайны. Наяўныя канструкцыі з часоў ПСВ (амбразурны вузел і кулямётны стол) былі захаваны (іл. 37) альбо рэканструяваны (уласна бункер ДАКа) (іл. 38, 39). Амбразура з напрамкам на поўдзень была выяўлена таксама і са знешняга боку замка (іл. 40, 41). Завяршэнне аркі брамы аднаўлялася таксама




Іл. 29. Фіксацыя захаванага ўзроўню паўднёва-заходняй сцяны Крэўскага замка (чорная лінія) і рэканструкцыя плоскасці сцяны разам з аркай Малой брамы (чырвоная лінія). Пазначаны аб'ём ДАКа. Фасад з боку дзядзінца



Іл. 30. Першапачатковы праектны варыянт размяшчэння Малой брамы




Іл. 31. Праект кансервацыі паўднёва-заходняй сцяны Крэўскага замка з рэканструкцыяй Малой брамы. Распрацоўка архітэктара Алены Карлянок. 2022 г.



Іл. 32. Фрагмент паўднёва-заходняй сцяны Крэўскага замка з вонкавага боку. Перад расчысткай. Выгляд з паўднёвага захаду. Фотаздымак: 25 мая 2022 г.



Іл. 33. Цагляная муроўка на паўднёва-заходняй сцяне Крэўскага замка (з вонкавага боку). Фотаздымак: 25 мая 2022 г.



Іл. 34. Уключэнне каменных блокаў у цагляную муроўку
на паўднёва-заходняй сцяне Крэўскага замка (з вонкавага боку).
Фотаздымак: 25 мая 2022 г.



Іл. 35. Фрагмент паўднёва-заходняй сцяны Крэўскага замка з вонкавага боку.
Пасля расчысткі. Выгляд з паўднёвага захаду. Фотаздымак: 19 ліпеня 2022 г.



Іл. 36. Фрагмент паўднёва-заходняй сцяны Крэўскага замка з вонкавага боку. Пасля расчысткі. Выгляд з паўднёвага захаду. Фотаздымак: 19 ліпеня 2022 г.



Іл. 37. Закансерваваны амбразурны вузел ДАКа (амбразура і кулямётны стол). Выгляд з паўночнага захаду. Фотаздымак: 16 верасня 2023 г.



Іл. 38. Працэс рэканструкцыі Малой брамы і ДАКа.
Выгляд ад дзядзінца з усходняга боку.
Фотаздымак: 28 кастрычніка 2023 г.



Іл. 39. Працэс рэканструкцыі Малой брамы і ДАКа.
Выгляд ад дзядзінца з паўночна-ўсходняга боку.
Фотаздымак: 21 лістапада 2023 г.



Іл. 40. Працэс рэканструкцыі Малой брамы і кансервацыі амбразуры.
Паўднёва-заходняя сцяна Крэўскага замка. Знешні бок. Выгляд з поўдня.
Фотаздымак: 17 ліпеня 2023 г.



Іл. 41. Рэканструяваная Малая брама і закансерваваная амбразура.
Паўднёва-заходняя сцяна Крэўскага замка. Знешні бок. Выгляд з поўдня.
Фотаздымак: 28 кастрычніка 2023 г.



Іл. 42. Працэс рэканструявання перакрыцця аркі Малой брамы Крэўскага замка. Паўднёва-заходняя сцяна Крэўскага замка. Выгляд з усходу. Фотаздымак: 16 верасня 2023 г.

паводле ўстаноўленай падчас даследаванняў геаметрыі (іл. 42). Такім чынам, рэалізоўвалася канцэпцыя кансервацыі і рэстаўрацыі Крэўскага замка, якая рэпрэзентуе гэты аб'ект не толькі як помнік сярэднявечнай фартыфікацыі, але таксама як месца памяці Першай сусветнай вайны.

## Аналагі

Адносна Малой брамы Крэўскага замка ўзнікаюць два пытанні, якія тычацца як колькасці брам у замках падобнага тыпу, так і іх марфалогіі – канфігурацыя аркі і размяшчэнне брамы ў сцяне. Спічасты характар аркі пацвярджаецца фотаздымкамі з часоў ПСВ. Для карэктнага параўнаўчага аналізу варта ўзяць два захаваныя замкі-кастэлі ВКЛ, пабудаваныя таксама ў першай палове XIV ст. – у Медніках (літ. Medininkai) і Лідзе. Архітэктурна-археалагічныя даследаванні і вывучэнне іканаграфіі і планаметрыі дазваляе сцвярджаць, што Медніцкі замак меў чатыры брамы, адна з якіх знаходзілася каля данжона, які, як і ў выпадку з Крэўскім замкам, выступае за асноўны перыметр замкавых муроў[1] (іл. 43). У паўночным і паўднёвым

[1] *Абрамаускас С.* К вопросу генеза крепостных сооружений типа кастель в Литве (на примере замка Медининкай) // Научные труды высших учебных заведений Литов-



Іл. 43. Медніцкі замак. Рэканструкцыя архітэктара Сігіціса Ласавіцкага (Sigitis Lasavickas)

мурах былі зроблены так званыя верхнія брамы, паднятыя над зямлёй на вышыні прыкладна 5 м. Трапіць у замак праз іх можна было толькі з дапамогай адкідных мастоў. Падчас рэканструкцыі, этап якой закончыўся ў 2012 г., былі адноўлены паводле праекта Ёнаса Глямжы (Jonas Glemža)[1], у тым ліку аб'ём данжона і частка мура над брамай, якую вежа абараняла і якая была раней закансерваванай[2] (іл. 44, 45).

У яшчэ адным найбліжэйшым аналагу Крэўскага замка – Лідскім замку – зафіксаваны тры брамы рознага функцыянальнага прызначэння. Усе яны захавалі свае арачныя праёмы, і можна казаць пра іх памеры. Ва ўсходнім муры, каля паўночна-ўсходняга кута замка, знаходзіцца вялікая (4,5 м шырыні і 6 м вышыні) і меншая (2,45 м шырыні і 3 м вышыні) брамы (іл. 46, 47). Паводле графічных малюнкаў XIX ст., можна зрабіць выснову, што вялікая

---

ской ССР. Строительство и архитектура. – 1963. – Т. III, № 1. – С. 73–103; *Jurginis J.* Medinikų pilis // Lietuvos pilys / ats. red. J. Jurginis. – Vilnius : Mintis, 1971. – P. 175.

[1] *Glemža J.* Medininku Castle // Castella Maris Baltici. – Vilnius : Savastis, 2004. – [V.] 6. – S. 95.

[2] *Дзярновіч А.* Медніцкі замак як выклік беларускім рэстаўратарам // Праблемы аховы і інтэрпрэтацыі помнікаў гісторыі і культуры, грамадска-дзяржаўнае партнёрства. – Мн., 2016. – С. 104–112.



Іл. 44. Медніцкі замак. Рэканструяваныя вежа-данжон і брама ў паўночным муры.
Від з боку дзядзінца. Фотаздымак Конціса Шатунаса (Kontis Šatūnas).
30 верасня 2012 г.



Іл. 45. Медніцкі замак. Рэканструяваная брама ў паўночным муры.
Від з вонкавага боку. Фотаздымак Aidas U, 5 ліпеня 2015 г.



Іл. 46. Лідскі замак. Фрагмент абмераў усходняй сцяны з боку дзядзінца: руіны паўночна-ўсходняй вежы, вялікая брама, меншая брама. Аўтар невядомы. Другая палова XIX ст. (Папера, акварэль, гуаш, пяро. 336 × 495 мм). Навукова-даследчы музей пры Расійскай акадэміі мастацтваў (НИМ РАХ, КП-531/89-? А-4872: «Неизвестный автор. Обмер развалин Лидского замка. Стены восточная и северная (с внутренней стороны). 2-я половина XIX века»)



Іл. 47. Лідскі замак. Арачны праём меншай брамы. Фотаздымак 1946 г. Аўтарства невядомае



Іл. 48. Лідскі замак. Паўднёвая сцяна са знешняга боку.
Фотаздымак: Леанід Лаўрэш, 2024.



Іл. 49. Лідскі замак. Меншая брама ва ўсходняй сцяне. Выгляд з боку дзядзінца.
Фотаздымак: Леанід Лаўрэш, 2024

брама («Парадная») мела паўцыркульную арку[1]. Меншая брама («Службовая») выразна захавала характэрную спічастую арку. Вялікая брама мела разгрузачную спічастую нішу, прарэзаную ўваходным праёмам меншых памераў.

У паўднёвай сцяне на адлегласці 22 м ад паўднёва-заходняй вежы захаваўся невялікі паўцыркульны праём на вышыні 4 м ад першапачатковага ўзроўню двара (іл. 48). Трапіць у гэтую браму было магчыма толькі з дапамогай доўгай прыстаўной лесвіцы. Такое размяшчэнне брамы не адпавядае меркаванай яе функцыі як «запасной» брамы[2].

«Парадная» брама таксама размешчана на вышыні 2,5 м над узроўнем тагачаснай дзённай паверхні. Трапіць у замак праз вялікі ўваход можна было толькі дзякуючы пад'ёмнаму масту. Пра яго наяўнасць сведчыць вялікая разгрузачная спічастая ніша, якую праразаў уваходны праём меншых памераў.

Малая брама знаходзілася ніжэй за іншыя. Менавіта таму для яе абароны знадворку была створана дадатковая канструкцыя – падковападобнае ў плане збудаванне, кшталту барбакана, толькі з унутранага боку[3] (іл. 49).

Такім чынам, як спічастасць арак брам, найперш малых, так і іх вышыннае размяшчэнне пацвярджаюцца аналагамі з іншых замкаў-кастэляў ВКЛ.

## Высновы

Паводле праведзеных даследаванняў можна сцвярджаць, што Малая брама Крэўскага замка знаходзілася на адной лініі з Галоўнай брамай у паўночна-ўсходняй сцяне. Малая брама адрознівалася спічастай гатычнай канструкцыяй, унутраная арка якой мела ў шырыні 2400 мм. Ніжняя плашчыня брамы знаходзілася на вышыні 5,3 м з боку дзядзінца адносна актуальнай адзнакі паверхні; 2,7 м – са знешняга боку. Трапіць да Малой брамы можна было толькі праз масты, канструкцыю якіх трэба яшчэ даследаваць. Арка брамы датрывала да пачатку Першай сусветнай вайны, падчас якой кайзераўскія войскі скарысталі яе для ўсталявання агнявой кропкі. У выніку баёў арка, як і значная частка ацалелых на той момант канструкцый замка, была разбурана.

Лакалізацыя Малой брамы Крэўскага замка стала магчымай у выніку арганізацыі комплексных даследаванняў – правядзення на аб'екце архітэктурна-археалагічнага вывучэння і сумяшчэння яго вынікаў з фотаматэрыяламі пачатку XX ст. і сучаснымі фотаздымкамі. Можна казаць пра распра-

[1] *Ткачоў М. А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. – С. 29.

[2] *Кушнярэвіч А. М.* Мураваная дабастыённая фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага. – Мн. : Бел. навука, 2014. – С. 94–95.

[3] *Трусаў А.* Старадаўніх муроў адраджэнне: мінулае і сучаснасць Лідскага замка. – Мн. : Полымя, 1990. – С. 15–16.

цоўку методыкі лакалізацыі аб'ектаў сярэднявечных мураваных фартыфікацыйных збудаванняў, якія панеслі значныя страты ў сваіх канструкцыях. Важнай часткаю гэтай методыкі з'яўляецца ўсталяванне карэляцыі паміж часткамі старажытных пабудоў і канструкцыямі Новага і Найноўшага часу. Архітэктурна-археалагічныя даследаванні дапамагаюць тут найперш у пошуку і расчытцы старажытных элементаў пабудовы, а таксама ў вызначэнні кантактнай зоны паміж імі. Супастаўленне даўніх і сучасных здымкаў дапамагае ў прывязцы выяў гістарычных канструкцый да актуальнай архітэктурнай сітуацыі.

Падобная архітэктурна-археалагічная методыка з'яўляецца неабходнай часткай кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры. Праведзеныя ў 2022 г. даследаванні дазволілі скарэкціраваць праект рэканструкцыі Малой брамы і ажыццявіць яго на працягу 2022–2023 гг.

**Андрэй Шулаеў** *(Мінск)*

## БУДЫНАК КРЭЎСКАЙ МУРАВАНАЙ СІНАГОГІ: ТРАНСФАРМАЦЫЯ ВОБРАЗУ І ФУНКЦЫІ

### Значэнне будынка Крэўскай мураванай сінагогі для гістарычнага цэнтра Крэва і для ўспрыняцця ансамбля Крэўскага замка

Працы па кансервацыі Крэўскага замка, што распачаліся некалькі гадоў таму, непазбежна прыводзяць нас да праблемы рэвіталізацыі яго гістарычнага асяродку, важным элементам якога ёсць будынак Крэўскай мураванай сінагогі. Надзвычай важнае яе значэнне для Крэва выцякае з наступных пунктаў:

1) Крэўская мураваная сінагога рэпрэзентуе сабой агромністы культурны пласт Крэва, на жаль, ужо страчаны сёння, гэта – месца памяці яўрэйскай культурна-рэлігійнай супольнасці мястэчка (а пасля – места) Крэва;

2) будынак Крэўскай мураванай сінагогі – адно з чатырох збудаванняў Крэва, што перажылі Першую сусветную вайну і, адпаведна, старэйшых за пачатак XX ст. (разам з Крэўскім замкам, Свята-Аляксандраўскай царквой і яўрэйскай мураванай лазняй);

3) будынак сінагогі ў Крэве, як выглядае, – адзіны мураваны будынак сінагогі, захаваны ў Смаргонскім раёне;

4) Крэўская мураваная сінагога – важная горадабудаўнічая дамінанта таго раёна гістарычнага цэнтра Крэва, што прымыкаў да руін Крэўскага замка з боку Старога рынку. Будынак быў збудаваны паміж Гандлёвым рынкам і Крэўскім замкам пры найстаражытнейшай вуліцы – Замкавай, што перадумовіла на стагоддзі наперад успрыняцце Крэўскага замка разам з сінагогай;